Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 16 (609). Wilnia, Niadziela 14 Krasawika 1935 h. Hod XI (XIX).

KSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Новая Канстытуцыя і мы

Ужо аддаўна ў Польшчы была актуальнай справа зьмены старой на новую Конституцыю. Шмат аб гэтым было пісана ў газэтах, а яшчэ больш гаворана ў соймавых камісіях і на пленуме Сойму. Урэшце 23.III. сёл. г. на гэтым-жа пленуме Сойму была прынята новая Конституцыя. Галасавала за яе 260 паслоў (сярод якіх 245 бэбэкаў), проціў 139 паслоў (польскія опозыцыйныя партыі), 44 паслы (украінцы, жыды, немцы і беларус) ад галасаваньня ўстрымаліся, 1 падаў пустую картачку. Выходзіць, што новая Конституцыя паявілася на сьвет, у пэўнай меры, дзякуючы ўстрыманьню украінцаў, жыдоў, немцаў і беларуса.

У старой Конституцыі сучаснаму правячаму ў Польшчы палітычнаму кірунку не падабалася яе дэмократычнасьць. У старой Конституцыі ўся уставадаўчая ўлада была ў руках Сойму, выбранага на падставе дэмократычных выбараў. Ад гэтага-ж Сойму цалком быў залежны і ўрад. У Конституцыі-ж новай з гэтым усім справа выглядае куды йнакш.

Яна проста нябывалай уладай абдарае Прэзыдэнта, як галаву дзяржавы. Паводле новай Конституцыі Прэзыдэнт па сваей волі назначае прэм'ера міністраў, склікае й распускае Сойм і Сэнат, зьяўляецца галавой збройных сіл, рашае пра вайну, заключае ўмовы з іншымі дзяржавамі і інш.

Апрача гэтых сапраўды нябывалых правоў наводле новай Конституцыі мае Прэзыдэнт яшчэ ці мала так званых правоў, на падставе якіх ён аднаго з двух кандыдатаў вызначае на Прэзыдэнта, як свайго наступніка, назначае і адклікае старшыню Найвышэйшага Суду і Кантрольнай Палаты, назначае трэцюю часьць сэнатараў, аддае пад суд абвінавачаных міністраў, шмат у чым можа выдаваць законы, ня пытаючыся Сойму і Сэнату. За свае ўрадавыя чыны Прэзыдэнт паводле новай Конституцыі адказны (арт. 2 і 15) толькі прад Богам і прад гісторыяй. Нават за чыны, не зьвязаныя з яго ўрадаваньнем, ня можна Прэзыдэнта пацягнуць да адказнасьці, покуль ён Прэзыдэнтам. Словам, Прэзыдэнт Польшчы цяпер мае большыя правы, як не адзін манарх у Эўропе.

Што датыча няпольскіх народаў у Польшчы, так зв. нацыянальных меншасьцяў, дык тыя ўсе артыкулы, што былі ў старой Конституцыі і што агулам датычылі правоў гэных народаў, пакінуты так-жа й у Конституцыі новай. Але гэта, ведама, як нічога нацыянальным меншасьцям у іхным жыцьці практычна не давала даўней, так нічога ў гэтым сэнсе ня дасьць і сяньня. У Польшчы няпольскіх народаў (беларусаў, украінцаў, літоўцаў, жыдоў і інш.) знаходзіцца 10 мільёнаў і на добры лад у Конституцыі правы кожнага з іх павінны былі-б быць загварантаваны сусім конкрэтна. Тымчасам нічога падобнага там не спатыкаем. Украінцы падавалі праект для сваіх зямель тэрыторыяльнай аўтономіі. Большасьць аднак соймавая праект гэны адкінула й у новую Конституцыю ён, як ведама, ня ўведзены.

Др. В. Загайкевіч тлумачачы ў Сойме, чаму украінскія паслы ад галасаваньня ў справе новай Конституцыі ўстрымліваюцца, між іншым заявіў, што «...права украінскага народу, як зборнай нацыянальнай адзінкі не знаходзіць у новай Конституцыі — таксама як і ў старой — ніякай праўнай гваранцыі... Заяўляем, што як-бы польскі народ не вырашаў формы ўстрою Польшчы, украінскі народ ня прыпыніць сваей барацьбы за паўнату належных яму палітычна нацыянальных правоў».

Падобна на гэтую справу глядзім і мы. Калі новая Конституцыя Польшчы мінае беларусаў, як асобную нацыю, якой належаць і асобныя правы, дык гэта для нас цьвёрдая школа, якая павінна нам адкрыць вочы на жорсткую праўду, павінна нас лучыць і далей гадаваць для лепшай будучыні беларускага народу.

Агульны гадавы сход Рады Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры

У нядзелю 31.III. с. г. адбыўся звычайны гадавы сход Рады Беларускага Інстытуту Гасп. і Культуры. Сход гэты, таксама як і леташні, меў для жыцьця гэтай інстытуцыі вялікае значэньне. Дзеля гэтага затрымаемся над ім даўжэй.

I. Адчыненьне сходу.

У гадзіне 19 мін. 30 сход Рады быў адчынены старшынёю Інстытуту кс. В. Гадлеўскім. Успомніўшы аб перашкодах у працы і наагул труднасьцях, якія перанёс Інстытут за мінулы год, старшыня затрымаўся над стратай, якую меў Інстытут у 1934 годзе ў сьмерці сэкратара Інстытуту сьв. п. Альбіна Стэповіча і запрапанаваў прысутным ушанаваць памяць нябошчыка паўстаньнем з мясцоў і хвілінай маўчаньня. Пасьля гэтага жалобнага ўспаміну старшыня адчытаў параграфы 28, 30 і 31 статуту, якія датычаць сходаў Рады і запрапанаваў выбраць старшыню сходу. Праз дружную аклямацыю быў выбраны мгр. Мікалай Шкялёнак, які, заняўшы месца за прэзыдыяльным сталом, паклікаў на сэкратара сходу інж. А. Клімовіча.

Пасьля выбару прэзыдыюму, быў прыняты сходам такі парадак дня: 1) справаздача Цэнтральнага Ураду з дзейнасьці за 1934 год, 2) выбары новых уладаў Інстытуту, 3) плян працы на будучыню і 4) бягучыя справы.

II. Справаздача з дзейнасьці Інстытуту за 1934 год.

Пасьля прыняцьця парадку дня слова было дадзена дагэтуляшняму старшыні Цэнтр. Ураду кс. В. Гадлеўскаму, які ад імя Цэнтр. Ураду даваў справаздачу за 1934 год. Справаздаўца падзяліў сваю справаздачу на 4 часьці: 1) арганізацыйныя справы, 2) выдавецкая праца, 3) стан працы Інстытуту ў лічбах і 4) бягучыя справы.

1) Што датыча арганізацыйнай працы, то пасьля пролілагодняга сходу Рады, на якім былі сарганізаваны 4 сэкцыі Інстытуту, Цэнтр. Урад выдаў да ўсяго беларускага грамадзянства адозву, у якой заклікаў усіх беларускіх дзеячоў, працуючых на ніве культуры аб'яднацца пад знакам Інстытуту і працаваць для дабра беларускага народу. У гэтай адозве, якая была надрукавана ў прэсе і выйшла асобнай адбіткай, Цэнтр. Урад паведамляў аб арганізаваньні пры Інстытуце агульна-беларускай бібліятэкі і музэю, заклікаючы ўсіх людзей добрае волі да ахвяроўваньня кніг і старадаўных рэчаў у Інстытут. Адозва гэта не асталася бяз водгуку, шмат хто пасьпяшыў з сваей ахвярай, прысылаючы ў бібліятэку і музэй Інстытуту кнігі, рэдкія нумары даўнейшых газэт, манэты і інш. рэчы. Апроч гэтага Інстытут наладзіў абмен выданьнямі з цэлым радам навуковых установаў у краі і загранірай, паміж іншым і з Беларускай Акадэміяй Навук у Менску.

Дня 8 XII.34 г. Інстытут зладзіў вялікую жалобную акадэмію па сьв. п. Бр. Эпімах-Шыпіле, на якой кс. А. Станкевіч прачытаў рэфэрат аб жыцьці і працы нябожчыка, а прысутныя дзяліліся цёплымі ўспамінамі аб адыйшоўшым на той сьвет адным з вялікіх піонэраў беларускага адраджэньня.

У працягу 1934 году былі аканчальна сарганізаваны навуковыя сэкцыі Інстытуту: а) эканомікі і статыстыкі, б) этнографіі і археолёгіі, в) гісторыі і соцыялёгіі, г) літэратуры і мастацтва). Былі апрацаваны і надрукаваны рэгуляміны для кожнай сэкцыі і прыступлена да навуковай працы. Дзьве сэкцыі маюць ужо свае органы (сэкцыя эканомікі і статыстыкі — „Самапомач", а сэкцыя літаратуры і мастацтва — „Калосьсе"). Сэкцыя этнографіі і археолёгіі пачала працаваць над закладзінамі бел. музэю пры Інстытуце.

Пераходзячы ад працы ў цэнтры да арганізацыйнае працы на вёсцы, справаздаўца адзначыў, што Інстытут меў на вёсцы вялікія труднасьці з вымогамі адміністрацыйных уладаў. Калі ў цэнтры гэтых труднасьцяў бадай няма, то на вёсцы яны на парадку дня. Справаздаўца адцеміў, што Інстытут цяпер адзіная беларуская арганізацыя, якая мае свае аддзелы на вёсцы і якія там вядуць сваю працу. Разьвіцьць гэтай працы дзеля розных перашкодаў яны аднак ня могуць. Ды ня толькі разьвіць працу, але і заложыць гурток Інстытуту цяпер ня так лёгка.

Новыя законы з 1932 году аб таварыствах і саюзах перакінулі ўвесь цяжар закладаньня аддзелаў (гурткоў) таварыства з цэнтру на самых закладчыкаў. Пасьля паданьня ў стараства заявы аб заснаваньні гуртка, закладчыкаў падрабязна дапытвае паліцыя і праводзіць сьледзтва як аб закладчыках так і мэтах гуртка. Пры гэтым некаторыя старaствы (напр. Навагрaдзкае) вымагаюць ад закладчыкаў стэмплёвай аплаты; людзі плацяць — і ў рэзультаце атрымоўваюць адказ, што гурток незарэестраваны. Так было ў Мондзіне і Вярашычах Наваградзкага павету. Калі Цэнтраля Інстытуту спытала ў старасты, на якой падставе ён бярэ стэмплёвыя аплаты пры рэестраваньні гурткоў, стараста не дало яшчэ адказу. Бяручы пад увагу грамадзкую нявыробленасьць нашай вёскі, няведаньне абавязуючых законаў, вымаганьне стэмплёвай аплаты ды яшчэ допыты паліцыі, справа з арганізацыяй новых гурткоў Інстытуту прадстаўляецца вельмі сумна. Трэба сказаць праўду, што з пяці заяў, пасланых у працягу году да розных старастваў, ніводнага пазытыўнага выніку, ніводнага гуртка. І так ня былі зарэестраваны гурткі: у Анісімавічах, Баранавіцкага пав. (там пасьля допытаў паліцыі закладчыкі адказаліся ад закладзін гуртка), тое самае ў Палікшах, Маладэчанскага пав.; у Навагрaдзкім павеце незарэестраваных было тры: у Дэлятычах, Мондзіне і Вярашычах. Прычыны незарэестраваньня былі розныя, але найчасьцей такія, якія падаў Навагрaдзкі стараста закладчыкам гуртка ў Вярашычах: *„Przyjmując pod uwagę, że tam uzasadnione powody do stwierdzenia, iż działalność wspomnianego koła będzie wykraczała poza ramy przepisów określonych w statucie, oraz z uwagi na bezpieczeństwo i porządek publiczny... postanawiam: zgłoszenia nie przyjąć do wiadomości i nie zezwolić na założenie koła..."*

Гэта тыповы адмоўны адказ на закладзіны гурткоў Інстытуту. Але апроч таго, што адміністрацыйныя ўлады не далі згоды на адчыненьне пяці гурткоў, яшчэ пяць былі закрыты, а іменна: у Крыніцы, Радашкавічах і Дуброве, Маладэчанскага пав., у Мур. Ашмянцы, Ашмянскага пав., і Новай Мышы,

Баранавіцкага пав. Гэтакім парадкам Інстытут выйшаў з 1934 году з вялікім дэфіцытам.

Аднак паміма ўсяго Інстытут налічвае яшчэ болей 20 гурткоў, якія, ня гледзячы на розныя перашкоды, праводзяць на вёсцы ідэі Інстытуту (падняцьце гаспадарчае і культурнае беларускага народу).

2) Выдавецкая праца. Як было ўжо сказана, пры Інстытуце выдаюцца два часапісы: эканамічны месячнік „Самапомач“ і навукова-літаратурны трымесячнік „Калосьсе“. Апроч гэтых двух пэрыёдыкаў, Інстытут выдаў: 1) „Na pokuci“ — зборнік баек і розных вершаў Янкі Быліны (сканфіскаваны), 2) „Шляхам Жыцьця“ — Я. Купалы і здаў у друк сьпеўнік „Za Haćkaŭščynu“ укладу А. Стэповіча. Апошнія два друкі былі выданы пры помачы беларускай друкарні ім. Фр. Скарыны. Наагул выдавецкая праца Інстытуту ў 1934 годзе выказвае большы размах, чым у папярэднім годзе.

3) Затое праца ў лічбах Інстытуту была меншай, чым у прошлым годзе. Усе гурткі маюць каля 10 тысяч кніг у сваіх бібліятэках; на гэты год быў кінуты Цэнтраляй кліч: „Гурткі, упарадкуйце вашы бібліятэкі“! Дзеля гэтага ў болей дзейных гуртках ідзе інтэнсыўная праца каля сабраньня і ўпарадкаваньня кніг.

Паводле прысыланых справаздач, гурткамі было наладжана: вечарын і іншых таварыскіх імпрэзаў каля 100; лекцыяў — каля 40; прадстаўленьняў — каля 50. З тэатральнымі прадстаўленьнямі былі труднасьці, бо некаторыя старасты жадалі стэмплёвых аплатаў 5 зал. і за дазвол 5 зал., значыць сам дазвол каштаваў 10 зал., а калі былі залучнікі, то і даражэй. Ня ўсе гурткі змаглі плаціць 10 зал. і затым дзейнасьць у галіне спэктакляў мясцамі прыпынілася.

4) Фінансы прадстаўляюцца найгорш, бо Інстытут ня мае ніадкуль сталае падмогі і жыве са складак сяброў і ахвяр лепшых грамадзян. На часапісы (напр. на „Калосьсе“) людзі добрае волі ападаткаваліся і кожны месяц плацяць задэкляраваную суму.

На гэтым справаздача была закончана. Пасьля дадатковых інфармацыяў некаторых сяброў Рады аб труднасьцях працы на вёсцы справаздача была прынята і выражана падзяка ўступаючаму ўраду за яго працу.

III. Выбары новых уладаў Інстытуту на 1935 год.

Пасьля прыняцьця справаздачы, Рада прыступіла да выбару Цэнтральнага Ураду Інстытуту і Рэвізыйнай Камісіі.

На старшыню быў выбраны праз аклямацыю даўнейшы старшыня кс. В. Гадлеўскі, а на віцэ-старшыні: інж. Л. Дубейкаўскі і мгр. М. Шкялёнак, на скарбніка — інж. А. Клімовіч, на сэкратара — Ул. Казлоўскі, сябрамі Ураду — абс. М. Пяцюкевіч і В. Войтэнка. У заступнікі: мгр. Ян Шутовіч і абс. Я. Малецкі.

У Рэвізыйную Камісію: кс. А. Станкевіч, рэд. Я. Пазьняк і рэд. Я. Найдзюк.

IV. Плян працы на будучыню.

Калі Інстытут мае адусюль гэтакія труднасьці, то што рабіць? — гэтакае пытаньне выклікала ў прысутных доўгую і карысную дыскусію на тэму пляну працы на будучыню.

1. Прадусім была выказана думка, што трэба яшчэ болей разьвіваць і пашырыць выдавецтва, каб даць народу як найбольш карыснага друкаванага слова, тымболей, што жывое беларускае слова з цэнтру дзеля розных прычын не заўсёды можа дайсьці. Побач з творамі прыгожага пісьменства трэба друкаваць і пашыраць грамадзкую літаратуру (эканамічна-культурнага зьместу), каб народ беларускі пазнаваў сябе самога, свае правы і мог іх бараніць.

2. Але не даволі надрукаваць літаратуру, трэба яе і пашыраць, а каб пашыраць рацыянальна, трэба наладзіць прадажу кніг і розных друкаў. Гэта можна было-б найлепш рабіць на кірмашных рынках; прадаўцы такіх друкаў маглі-б мець з прадажы добры даход (так як напр. з беларускім адрыўным календаром, каторы так разыйшоўся, што няма нават у архівах).

3. Ня гледзячы на ўсялякія труднасьці, трэба далей старацца закладаць гурткі, як цэнтры беларускага гаспадарча-культурнага жыцьця на правінцыі. Пры гэтым была выказана думка, што Інстытут, хоць і празначаны для масаў, але сам па сабе ён ня ёсьць масавай арганізацыяй. Інстытут гуртуе ў сабе ня масы, але адзінкі якія хочуць і могуць працаваць для масаў. Такой культурнай і гаспадарчай працы не забараняе ані польская канстытуцыя (як старая так і новая), ані польскія ўставы і дзеля таго беларусы могуць і павінны змагацца з кожнай крыўдай, якую церпяць. На Радзе было выражана пажаданьне, каб Цэнтраля падала вышэйшым дзяржаўным уладам мэморыял, выказваючы ўсе труднасьці і перашкоды, стаўленыя ніжэйшымі адміністрацыйнымі ўладамі працы Інстытуту.

4) Пастаноўлена ажывіць дзейнасьць існуючых гурткоў: а) праз адведываньне іх і падмацовываньне жывым словам, б) праз апрацоўваньне і пасыланьне адумысловых рэфэратаў, якія чыталіся-б на зборках гурткоў. На гэтае пастаноўлена зьбіраць фонд Інстытуту і заклікаць усіх грамадзян да ахвяр на гэты фонд.

5) Пастаноўлена правесьці збор усіх беларускіх кніжак у бібліятэку Інстытуту, з тым, каб гэта бібліятэка памагчымасьці мела ўсе беларускія кніжкі. Дзеля збору кніжак выбрана спэцыяльная камісія.

V. Бягучыя справы.

У бягучых справах было закранута вельмі важнае пытаньне: як аднесьціся да фактаў перакладаньня беларускіх народных песьняў на іншыя мовы і падаваньня як песьняў небеларускіх? У гэтай справе даручана адумысловай камісіі выкрываць такія факты, кляйміць іх і пратэставаць перад усім грамадзянствам проціў такога паступку.

На гэтым сход быў зачынены а гадз. 21 мін. 10.

Ад рэдакцыі: Зьвяртаем асаблівую ўвагу на **варункі беларускай культурна-прасьветнай працы**, у якіх яе праводзіць Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

Аб гэтых варунках павінен быў ведаць і пасол Ярэміч!

Дык ці ён, пасол Ярэміч, аб гэтых варунках расказываў міністру ўнутраных спраў Касьцялкоўскаму, катораму падлягаюць павятовыя старасты і ваяводы, і якога пасол Ярэміч у Сойме гэтак хваліў? Калі расказываў, дык цікава, які на гэтыя варункі мін. Касьцялкоўскі мае пагляд?

Можа пасол Ярэміч хоць аб гэтым штось скажа беларусам. Чакаем!

Беларускі Народны Календар (кніжка) на 1936 г.

На апошнім паседжаньні Цэнтр. Ураду Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры між іншым пастаноўлена было запачаткаваць сталае выдаваньне беларускіх календароў кніжак. Першы гэткі календар пастаноўлена выдаць ужо на 1936 г. і назваць яго „Беларускім Народным Календаром“. Бліжэй аб гэтым напішам у наступным нумары „Беларускай Крыніцы“.

Сьвяткаваньне 25-га сакавіка.

1. У Празе Чэскай.

У Празе (Чэхаславаччына) 25 сакавіка сьвяткаваньне семнаццатых угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі адбылося сёлета надзвычайна ўрачыста і ўдала.

Многі лік гасьцей цалком перапоўніў залю, дзе адбывалася ўрачыстасьць. Глыбока-сэрдэчныя прывітаньні прадстаўнікоў арганізацыяў яскрава сьведчаць аб адказнасьці перажываемага часу і аб солідарнасьці паміж прадстаўнікамі паняволеных народаў, выяўляўшых сабою як-бы адну агульную сям'ю.

Урачыстае паседжаньне вёў старшыня сьвяткаваньня інж. В. Русак.

Пасьля кароткай прамовы старшыні, былі два рэфэраты: грам. В. Захарка прачытаў на тэму „Гістарычныя асновы беларускай дзяржаўнасьці,“ а грам. д-р. Т. Грыб на тэму „Доля Беларусі ў асьвятленьні новай навукі.“

Па рэфэратах адбыліся прывітаньні Беларускага Народу. Вусныя прывітаньні выказалі наступныя прадстаўнікі:

1) Старшыня Украінскага Камітэту ў Чэхаславаччыне А. Г. Макарэнко,

2) Прадстаўнік Грузінскай эміграцыі — грам. Е. Ламтатідзе,

3) Прадстаўнік Калмыцкай эміграцыі — грам. Б. Уланаў,

4) Прадстаўнік Вольна-Казацкіх арганізацыяў, Казакоў нацыяналістаў, — др. С. Федараў,

5) Старшыня Украінскай Жаночай Нацыянальнай Рады праф. С. Русава,

6) Старшыня музэю вызвольнай барацьбы Украіны — праф. Д. Антановіч,

7) Старшыня Украінскага Жаночага Саюзу — З. Мірная,

8) Былы Міністр Фінансаў Украінскай Народнай Рэспублікі — праф. Б. Мартас,

9) Прадстаўнік Саюзу Украінскіх Эміграцыйных арганізацыяў у Празе — інж. О. Левіцкій,

10) Прадстаўнік Украінскай Акадэмічнай Грамады інж. Р. Фодчук,

11) Прадстаўнік Цэнтральнага Камітэту Украінскай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянэраў — М. Скідач,

12) Прадстаўнік Грамады Кубанцаў — др. У. Курганскі.

Выражаючы глыбокае спачуцьцё Беларускага Народу, усе прамоўцы адцемілі, што змаганьні Беларусаў за нацыянальна-дзяржаўнае вызваленьне ім добра ведама.

Прамоўцы казалі — мы ўпэўнены, што гістарычная беларуская нацыя будзе вясьці сваю адраджэнскую працу да поўнай перамогі. На гэтым шляху Беларускі Народ — казалі прамоўцы — заўсёды можа разьлічаць ня толькі на спачуцьцё, але, у адпаведны час, і на падтрымку ўсіх народаў, ад Балтыцкага да Чорнага мора.

Пасьля вусных прывітаньняў былі прачытаны пісьменныя ад:

1) Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні,

2) Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры у Вільні,

3) Беларускай нацыянальна-незалежніцкай газэты „Беларуская Крыніца“ у Вільні,

4) Беларускага часапісу „Новы Шлях“ у Вільні,

5) Інж. А. Клімовіча з Вільні,

6) Беларускага Асьветнага Таварыства „Беларуская Хата“ ў Латвіі.

7) Былога пасла латвійскага Сойму У. Пігулеўскага.

8) Ураду Саюзу беларускіх студэнтаў у Бэрліне,

9) Украінскага Вольнага Унівэрсытэту ў Празе,

W. D—a.

25 sakawika u Pieraborach.

(Praciah, hl. „B. K.“ Nr. 15).

Na hetym świacie 25 sakawika ŭ Pieraborach adna duša ŭ henaj chacie lepš za ŭsich Michasia razumieła. Heta była Kaciaryna Chanionak. Pryhožaja nadta dziaŭčyna. Jana mieła choć pawolny, ale dobry charaktar. Wialikija, kruhłyja, a čystyja, jak kryštał, byli jaje wočy. Rusyja jaje wałasy, strojnym wianočkam u dźwie kasy splecianyja, abwiwali hałoŭku maładoj dziaŭčyny. Jaje browy, nos, ščoki, wusny i padbarodak byli tak dapasawaryja, što da twaru Kaciarynki ničoha nia možna było ani adniać, ani dabawić. I stworyć-ža Boh takuju pryhožuju biełaruskuju istotu, jak hetu našu miłuju Kaciarynku!

Kaciarynka za ŭsich dziaŭčat najstrajniej prybirałasia. Jaje šnuroŭka była najpryhažejšym uzoram biełaruskaj mody. Kaciarynka chadziła tolki ŭ čarawikach. Nahledziŭšysia na Kaciarynu, usie dziaŭčaty i maładzicy ŭ Pieraborach chadzili tolki ŭ čarawikach. Kaciaryna nia lubiła kapialuša, jana abychodziłasia tolki chustačkami. Ale i roznych chustačak jana mieła bahata! Najbolš jej prychodzili da twaru zialonyja chustački ŭ čyrwonyja kwietki. A čornaja chustačka ŭ žoŭtyja kwietki rabiła Kaciarynku nadta surjoznaj i pawažnaj. I wialikich i małych i prostych i jadwabnych było tam chustačak udowal. Dla Kaciarynki baćki nie žaleli ničoha.

Kaciaryna była mastak u wyšywańni i haftawańni. Jaje ścieny ŭ chacie byli makatkami ščylna zawiešany.

Hawaryła Kaciaryna zaŭsiody dareču, ale mała i pacichu. Na nizkija i niepatrebnyja hutarki jana zatykała swaje wušy. Na't kali Michaś za patrebaj jakoj da ich u chatu prychodziŭ, to jana ad jaho ŭ druhi pakoj uciakała. Na światkawańni hetym jana ad stała siadzieła daloka. Tolki razy dwa pohlad jaje spatkaŭsia z pohladam Michasiowym. Jana ławiła žywa kožnaje słowa Michasiowa, jana dumki jahonyja čytała, jak u knižcy. Michasia biełaruski entuzyjazm jej nadta padabaŭsia. I Kaciaryna była rašuča za tym, kab Biełaruś stałasia adrazu niezaležnaj, a dla nas, kab skarej blisnuła soniejka swabody. Kaciaryna była śpiawačkaj. Jaje alt u chory wydawaŭsia, a i salistkaj jana ad usich najlepiej śpiawała...

Światа 25 sakawika ŭ wioscy Pierabory skončyłasia. Dušoj zdawolenyja ludzi, raschodzilisia chto ŭ swaju chatu. Na ich twarach widać było miłaje zadumieńnie. Paziawajučy, śpiašalisia kabiety i wypiaredžawali mužčyn. Z światkawańnia wychodziŭ kožny niejkim adświežanym, wiasiołym. Byŭ pozny wiečar. Wioska była spawita hłybokim supakojem. Raz, druhi zabrachaŭ niejdzie sabaka; ab kamieńni zahrymieli padkoŭki; heta biełarusy ŭ Pieraborach wiartalisia z światkawańnia 25 sakawika. Wyrazna było čutno, jak hłucha hudzieŭ Nioman. Traščeła na im kryha. Tolki što niadaŭna jon na siabie pałamaŭ swaje ledzianyja akowy. Dychaŭ, baki padymaŭ, kruciŭsia ad radaści, bo pačuŭ swabodu i panios swaje wody, až u mora.

Da chataŭ swaich wiartalisia i Michaś z Kaciarynaj. Michaś padwioŭ Kaciarynu pad samuju bramu jejnaj chaty. Tam pad płakučaj biarozaj jany aboje zatrymalisia i ščyra miž saboj zahawaryli. Sercy ich adzin da druhoha bilisia małatkami.

Tam niedaloka byŭ hłyboki jar. Akurat na dźwie paławiny jon pierasiakaŭ Pierabory. Michasiowaja chata była dalej za heny jar. Na dnie jaru ŭ Nioman rwaŭsia wiasnawy ručej. U im doŭha i manatonna wada burleła, narušajučy ahulnuju cišyniu wioski. Maładaja para—Michaś z Kaciarynaj—da hetaha šumu wady doŭha prysłuchałasia. Zahawaryła pieršaja Kaciaryna: — Wada burlić—kazała jana—zaŭtra budzie pahoda. — Kab u našym žyćci biełaruskim hetak zaŭsiody burleła, jak jano ŭ nas było siahońnia na światkawańni, — adkazaŭ Michaś i jany ŭznoŭ maŭčali. Pa chwilinie ŭznoŭ ciahnuŭ Michaś: — My swajo zrabili, 25 sakawik, jak treba, adświatkawali. Bačycie, biareć wierch naša biełaruskaja siła. My stojkija ludzi ŭ Pieraborach! Na't nie bajalisia my palicyjanta. Jak ćwiorda my raźwiwali swaje ideały! Ja spacieŭ pad kaniec swajej mowy, ja nadta praniaŭsia jeju, a hlanuŭšy na ciabie, Kaciarynka, ja staraŭsia jašče lepš wydziaržać maje pazycyi.—Tut Michaś skončyŭ, uziaŭ za ruku Kaciarynu, a taja ŭ swaju čarhu kazała Michasiu: — Ja

Dr. St. Hrynkiewič.

Narodny Uniwersytet i Biełarusy.

I.

Dziŭna, našto hawaryć i pisać ab patrebie rodnaje aświety, rodnaje škoły! Siańnia niekatoryja prablemy absalutna **biazsumliŭnyja** dziela ŭsich. Hetkaju biazsumliŭnaju praŭdaju budzie prawa dziciaci da škoły, nawuki ŭ rodnaj mowie. U henaj škole dzicia ŭsmokča ŭ siabie tuju kryšku patrebnaje jamu wiedy, jakaja jamu budzie fundamantam dalejšaha razwoju. Swaja škoła — heta zaruka, što nia budzie ŭnutranych rastrusak u hetaha čaławieka, što ździejśnić jon maximum taho, što było ŭ miežach ahulnych jahonych mahčymaściaŭ. Swaja škoła—heta wialikaja palohka ŭ tym, kab abminuć trahičnyja sumliwy pary daśpiawańnia junackaha i šukańnia samoha siabie „čužymi wačyma". Tolki swaja škoła spakojna, roŭna prywiadzie kožnaha ŭ toje miesca, skul lohka acanić minuŭšynu, budučyniu i swajo miesca ŭ padziejach. Nieabchodnaść swaje škoły takaja samaja praŭda, jak prykładam toje, što raścinka dziela žyćcia patrabuje sonka. Nichto nia budzie piarečyć praŭdzie apošniaj! A pieršaj?!...

Žyćcio daje adkaz, adkaz heny daloka nie taki prosty, jak samaja prablema. U suwiazi z henym samym žyćciom, jakoje hetak umieje zabłytać adkaz na takoje prostaje pytańnie, jak patreba rodnaje škoły, wyrastaje miž inšym asabliwa jarka sprawa **narodnych uniwersytetaŭ**, jak biezadkładnaja zadača, jakuju treba wyrašyć čym chutčej. Dziela čaho j čamu — ubačym dalej.

Wiartajučysia da aświety, spytajem siabie, pašto jana?... Stawić henaje pytańnie zdajecca dziŭnym kožnamu. Sprawa wiadomaja i jasnaja. Kožny, i dzicia małoje, wiedaje, što aświeta siańnia heta ŭsieńka ŭ kožnaj płoščy žyćcia. Adnak kali krychu ŭdumacca ŭ pytańnie, dyk mo' i nia nadta niespadzieŭki dajšli-b my da wywadu, što kali-b źmiest aświety narodnaje byŭ abmiažowany ŭmiectwam čytać i pisać, dyk hetkaja sytuacyja była-b mała lepšaju za poŭnaje biazdziejańnie ŭ halinie aświety. Biazumoŭna, kožny niaświedama pomnić ab tym, što aświeta—heta nie samameta, a tolki sposab da ździejśnieńnia niečaha dalejšaha. Jość narody z małoju aświetaju, a jakija majuć swaju nadta bahatuju kulturu. Čytać nia ŭmiejuć, a jakoje ŭ ich bahaćcie baśniaŭ, pokazak, jakoje niawykaznaje pačućcio charastwa, chacia mo' i ŭ prymityŭnaj formie. Dyk ci nie šmat bahaciejšy bahaćciem duchowym hetki narod za tych, što ŭmiejuć dwaccać piać ci dwaccać siem litaraŭ i pry pomačy ich čytajuć sensacyjnyja knižycy?...

Nie chaču, kab zakinuli mnie warožyja ci niespahadnyja adnosiny da aświety šyrokaje, demokratyčnaje. Chacieŭ-by zrabić bolšy nacisk na toje, što aświetu treba razhladać na asnowiedzi prablemaŭ šyrejšych, u pieršuju čarhu ŭ płoščy kultury, budaŭnictwa jejnych samastojnych i nacyjanalnych formaŭ...

Dyk meta aświety budawać, padhataŭlać kulturnych pracaŭnikoŭ, pašyrać ichni świetapahlad, kruhazor žyćciowy.

Biazumoŭna, nia tolki henyja idealnyja, dalokija, wialikija zadačy maje pierad saboju aświeta. Žyćcio štodzień pakazywaje nam, što nie bahaćcie źjaŭlajecca toju mierkaju ščaścia i paśpiechu ŭ žyćci. Inšy maje ziamli dawoli, žywioła jamu dobra hadujecca i što jamu z taho, kali jon nia wiedaje ničoha dalej swajho nosa. Adno tolki, što jon kłuściej padješć, ci charašej apraniecca, a budzie zaŭsiody „durnym boŭdziłam". Druhomu jašče horš. Majučy ziamlu, jon na joj jašče bolš nachodajecca, jak jaho susied na małym kusočku ziamli, a karyści majuć amal nia toje samaje. „Bahatyr" dy biez aświety nia ŭmieje ŭziacca za rabotu, kab mieć takuju, jak treba, karyść.

Chacia siańnia napadajuć z roznych staron na demokratyzm, demokracyju, adnak treba pryznać, što jakha dziakujučy pryncypam demokratyzmu wyraŭnialisia da niekatoraje miery propaści pamiž biednym i bahatym, a mastom, jaki łučyć adnych i druhich, była aświeta.

II.

Adnoju z najpryhažejšych formaŭ aświety budzie Narodny Uniwersytet. Narodny Uniwersytet zawiecca narodnym dziela taho; što jon bliski da narodu, da jahonych patrebaŭ, a uniwersytetam zawiecca henaja ŭstanowa dziela taho, što haworyć ab wysokich, wialikich, wiečnych temach. Heta škoła, jakaja sapraŭdy ŭzhadowywaje čaławieka, jakaja pakazywaje jamu šyroki świet, jakaja pajaśniaje sens jahonaha žyćcia, jakaja pakazywaje adnačasna tyja šlachi, što wiaduć da taho kryšku ščaścia, jakoje patrebnaje kožnamu.

Kamu-ž bolš patrebnaja hetkaja škoła, jak nia nam Biełarusam? Siańnia, dy nia tolki siańnia, a mahčyma zaŭtra i pazaŭtra my budziem madzieć u swaich biedach, kłopatach, halicie... Budziem kažu, kali nia nojdziem dawoli enerhii, badzioraści, kab pačać nowaje žyćcio.

Narodny Uniwersytet dajučy ŭ najlepšaj, najlahčejšaj, najchutčejšaj formie henuju aświetu, patrebnuju nam u dasiahnieńni našych nacyjanalnych i žyćciowych patrebaŭ, budzie ślacham, cieraz jaki chutčej my budziem „ludźmi" zwacca.

Dyk woś dziela čaho niama nijakaje supiarečnaści pamiž tym, što kažu ja ab Uniwersytecie Narodnym biełaruskim, kali na't škoły swaje pačatkawaje my nia majem. Uniwersytet heny maje być adčaści lekam na henaje sumnaje źjawišča kryŭdy nacyjanalnaje biełaruskaje. Cieraz Nar. Uniw. my pawinny dajści da taho, kab dastać rodnuju školu ŭsich stupieniaŭ, a kali nie, dyk zbudawać ich samym.

Nar. Uniw. nia budzie niečym usiomahutnym, cieraz jaho nie prapaduć usie našyja niedachopy, heta sprawa jasnaja; zatoje Nar. Uniw. budzie krynicaju, adkul budziem čerpać čystuju, zdarowuju wadu, što dapamoža nam dakapacca da samych siabie, znajści ŭ sabie sapraŭdnych ludziej i znajści adkazy na pytańni, jakija najbujniej narastajuć u paru maładaści, u paru daśpiawańnia.

Nar. Uniw.—heta nie fachowaja adumysłowaja škoła, dzie nawučać kooperacyi, haspadarki, handlu ci jašče niečaha. Nie! Nar. Uniw. heta mahčymaść ujawić sabie ŭ šyrejšych masach asnaŭnoha fundamantu, na jakim staić čaławiek. Adzinka sapraŭdy tady tolki žywie, kali ad pary da pary ŭjaŭlaje i razumieje, na što toje usieńka, što bačyć kala siabie, i kali jana bačyć swoj šlach asnaŭny da mety žyćciowaha zmahańnia.

Ci hetkaja škoła nie fantazija? — zapytajucca „razwažnyja" ludzi, što zhubili pieršuju wostraść pahladaŭ i adnosinaŭ na žyćcia.

Ci ahułam mahčyma niekaha piararabić, dać biaz bolšaje padrychtoŭki ŭniwersalny adkaz na najważniejšyja pytańni?...

Sumliwy tolki na pieršy pahlad słušnyja. Sprawa ŭ tym, što sapraŭdnaja kultura nia mierycca ani bahaćciem matarjalnym (hrošy, ziamla), ani manierami, roŭniem aświety. Heta pamyłkowy pahlad, što kab zrazumieć najważniejšyja prajawy i zakony žyćciowyja, treba wysokaje aświety, treba hadami siadzieć nad knižkami. Inšy kančaje himnaziju i ŭniwersytet, a ničoha nie razumieje z taho, što kala jaho robicca, nia ŭmieje jon samastojna dumać, jon poŭnicca farmalnaju wiedaju, jon—jak toj bubion, što hrymić zdalok, a sapraŭdy dyk u siaredzinie parožni zusim.

Nar. Uniw. nia cikuje i nia imkniecca da henaje farmalnaje wiedy. U jom u syntezie na asnowiedzi historyi swaje baćkaŭščyny, na asnowiedzi historyi suświetnaje i historyi kultury supolna ŭsie prysutnyja imknucca ŭ praciahu niekalki miesiacaŭ pracy na Un. Nar. zrazumieć toje, što dziela nas najważniejšaje.

Nar. Uniw. zważaje bolš na ŭzhadawańnie pačućcia adzinki, jak intelektu. Ideja Nar. Uniw. naradziłasia ŭ Danii, i dziakujučy henym uniwersytetam siańnia maleńkaja, u niekalki razoŭ mienšaja i wialičynioju terytoryi i nasielnictwa, čymsia Biełaruś,— Danija źjaŭlajecca adnoju z najkulturniejšych krainaŭ i dziaržawaŭ. Nie kažu, što Dancy najbahaciejšy narod. Niama ŭ ich milioneraŭ ci miliarderaŭ, jak prykładam u Amerycy, za toje niama takoha biazdolla, takoha amal što pryhonnictwa ŭ adnosinach da inšych klasaŭ, jak bačym u toj samaj chacia-b Amerycy. U Danii sapraŭdny demokratyzm, žyćcio roŭnaje, spakojnaje.

Sapraŭdy prykład wartasny, kab jaho realizawać u našych umowach...

Praktyčnyja mahčymaści i realizacyju Nar. Uniw. u biełaruskich umowach abhaworym inšym razam.

Asudžeńnie hitleroŭcaŭ u Kłajpedzie.

U krai Kłajpeda, pałožanaj nad bieraham Bałtyckaha mora, ad najdaŭniejšych časoŭ žywuć litoŭcy. Ale ad 1328 h. kraj hety byŭ zawajawany niemcami i da 600 hadoŭ znachodziŭsia pad ich panawańniem. Praz hety čas u Kłajpedu napłyło niamała niemcaŭ z Niamieččyny, jakija natužywali ŭsie swaje siły dziela hetaha kraju aniamieččańnia. Pa kaściołach i pa ŭsich uradawych ustanowach była zawiedziena zamiest litoŭskaj mowa niamieckaja. Adnak kłajpedzkija litoŭcy, ahułam kažučy, swajej mowy nikoli nia wyraklisia i nie zabylisia. Badaj usie jany hetu mowu zachawali až da siańnia, siabie tak-ža ŭważajučy za litoŭcaŭ.

Pa wajnie niemcy byli prymušany Kłajpedy adračysia. Litwa tady jašče była słabaja i krajem hetym sajuznyja dziaržawy daručyli kirawać francuzam. Tymčasam 15.I.1923 h. nasielnictwa Kłajpedy zbuntawałasia praciŭ francuzaŭ i abjawiła, što kraj hety dałučaje da Litwy. Pryšłosia tady Litwie mieć dzieła z Francyjaj, Anhlijaj, Italijaj i Japonijaj, jak z dziaržawami, jakija pa wajnie ŭstanaŭlali nanowa paradak u Eŭropie. Woś-ža ŭ 1924 h. miž hetymi dziaržawami i Litwoj byŭ padpisany dahawor, na padstawie jakoha Kłajpeda pierachodziła da Litwy, jak niepadzielnaja jaje častka z aŭtanomičnym paradkam u nutry kraju.

10) Украінскай Навуковай Асоцыяцыі ў Празе,

11) Украінскага Таварыства „СІЧ" у Празе,

12) Украінскіх Січэвікоў у Пільзені,

13) Украінскага работніцкага Таварыства „СІЧ" у Маладой Беславіі,

14) Украінскага Хору ў Празе.

В. З.

2. У Пазнані.

Невялічкая, але актыўная беларуская калёнія ў Пазнані ня маючы магчымасьці адсьвяткаваць 17-х угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі ў дзень 25-га сакавіка, пастанавіла перасунуць сьвяткаваньне на дзень 7.IV.

Урачыстасьць пачалася ў памешканьні п. д-ра Грынкевіча а 5-ай гадзіне вечарам. На пачатак была адчытана Адозва АБСА, якую кароткай прамовай дапоўніў А. Анішчык. Аднамінутным паўстаньнем прысутныя ўшанавалі акт 25 сакавіка, пасьля чаго выслухалі дэклямацыю малых дзетак д-ра Грынкевіча нагроджаных гучнымі воплескамі. У мілым настроі, пры супольным абмене думак неўзаметку прайшоў вечар, пакідаючы у ўчасьнікаў няўмірucчыя ўражаньні.

heta daŭna wiedała, što z usich chłapcoŭ adzin ty ŭ wioscy najhruntaŭniej chwataješ biełaruskuju dumku. Kab hetakich, jak ty, chłapcoŭ u nas z dziesiatak, tady-b inačaj było-b i dla našaj baćkaŭščyny. Ja baču, što tabie ŭ pracy pamahajuć dobra Janka Juljanowič z Julukom Januškiewičam. Ja wiedaju, jakija baćki hetych chłapcoŭ. Jany da biełarusaŭ niaprychilnyja. Ja peŭnaja, što i hetyja chłopcy byli-b słabiejšyja biełarusy, kab dla Januka nie Razalka, a dla Juluka nie Karusia. Hetyja dźwie dziaŭčyny, dobryja maje tawaryški, jany ščyryja i nadta dobryja biełaruski. A baćki hetych dziaŭčat tolki i žywuć biełaruskimi dumkami. Swaje pahlady, jak biełarusy, baćki pieradali swaim dzieciam. Mnie zdajecca, što kab Janka z Julukom nia byli biełaruskaj dumki, to Razalka z Karusiaj takich chłapcoŭ da siabie na paroh nia ŭpuścili-b. Baćka Razalčyn tak i hladzić, kab z chłapcoŭ wybrać sabie ziacia samaha najlepšaha biełarusa. Ab hetym dobra wiedajuć usie Pierabory.—Tolki skončyła swaju mowu Kaciaryna, jak Michać choča ŭžo z jeju raźwitacca, bo jaho zaŭtra čakaje pilnaja rabota ŭ haspadarcy.

— Jašče na raźwitańnie — kazaŭ jon — da Ciabie, Kaciarynka, adno ja słoŭca maju. Nierazłučna pojdziem my z taboju praz usio žyćcio naša. Jak našy dumki ab niezaležnaści Biełarusi zaŭsiody z saboj zhodny, tak my ŭ zhodzie z taboj žyć i pracawać budziem. —

Tut Michaś padaŭ ruku Kaciarynie. Jany raźwitalisia.

Michaś išoŭ da swajej chaty. Jon sam sabie deklamawaŭ wierš: „Hej ty Nioman raka, ci ty dumaŭ, ci śniŭ, jak ślazu mužyka ŭ swaje wody ławiŭ. Jak stajaŭ nad taboj syn niadoli chudy i nad ciomnaj wadoj piajaŭ pieśni nudy. Što nadyjdzie para, zniemažeńnie minie, adradžeńnia zara nad narodam bliśnie"...

Michaś wiarnuŭsia damoŭ. Adčyniŭ waroty ad wulicy, nieaściarožna stuknuŭ imi ab hruby rasachaty klon. U sieni jon nia stukaŭsia. Ad sianiej u wakonca prasunuŭ jon ruku i adčyniŭ zapiortyja dźwiery. Paśla cichańka pierajšoŭ u druhi kaniec chaty. Jon pałažyŭsia spać, ale nie zasnuŭ całuju noč. Pa jahonaj haławie, jak wada płyli dumki. Jon najbolš pryłažyŭsia da hetaha światkawańnia ŭ Pieraborach. Jon mnoha času traciŭ dla ŭsiej hetaj sprawy. Pisaŭ u redakcyju, dwa razy chadziŭ da starasty. U wioscy jaho strašyli, kab nie dapuścić biełarusaŭ światkawać biełaruskaj niezaležnaści. Doŭha čakali na samaje sabrańnie, pakul usie paradki byli naładžany.

Dalej Michaś dumaŭ pra Mikitu, što stukaŭ kijom pa płocie.

Chto heta jość našy worahi? Hety Mikita i jahonaja kampanija,—jany-ž takija samyja, jak i my biełarusy. Jany tolki ślapoje aružža ŭ rukach našych sapraŭdnych worahaŭ. Henyja našy worahi siadziać niejdzie daloka, jany nas redka bačać i mała nas znajuć. Swaje niahodnyja plany jany wykonywajuć praz niahodnych našych bratoŭ. Urešcie skončyŭ Michaś swaje razważańni. Na zaru ŭžo zajmałasia. Michaś wyjšaŭ z chaty. Daloka niejdzie zakryčała knihaŭka. Prabudziŭsia žawaranak. Pačaŭ swaju pieśniu, ale nia skončyŭ. Była zimnawataja ranica. Świežaje pawietra praniało Michasia. Jon uzdryhnuŭsia, paziaŭnuŭ i wyšaŭ na harod hlanuć. Štoraz bolej na ŭschodzie nieba čyrwanieła. Niejčy koń užo wyrwaŭsia z chlewa i nozdrami wysoka fyrkaŭ u pawietry. Sa studni niechta wadu braŭ, bo nadta žurawiel skryhataŭ. Niejdzie zablajała awiečka. Na wulicy rezalisia dwa sabaki. Pa padworyščach sakatali kury. Tam u łuhu, hłyboka, abymajučy wiosku Pierabory, kaciŭsia mahutny Nioman. Nioman ciapier byŭ ciomna-bliskučy. Biełyja kryhi, jak awiečki pa im pławali. Michaś zahledziŭsia na Nioman. Jon ličyŭ bolšyja kryhi, jon zabaŭlaŭsia tym, jak kryha kryhu ławiła.

Raptam da Michasia padyšli chłapcy Janka z Julukom. Jany prybiehli zasopšysia, pierastrašanyja. Biadu tut jany pryniaśli. Za ŭčarašniaje światkawańnie treba płacić štraf. Palicyja nas kliča da siabie.

Razważna Michaś uziaŭ ad ich papierku ŭ ruki i dawaj jaje razhladać krytyčna. — Padłoh — jon kaža, — heta niechta nad nami hłumicca! — Tady chłapcy pawiesialeli, zaśmiajalisia i lahčej uzdychnuli.

Hetak adbyłosia biełaruskaje światkawańnie 25 sakawika ŭ wioscy Pieraborach nad Niomanam.

Baćki! Najlepšym światočnym padarkam dla Wašych dzietak budzie dobraja biełaruskaja knižka!

Niemcy, jak tolki krychu pa wajnie ačuchalisia, pačali rabić roznyja zachady, kab Kłajpedu wiarnuć da Niamieččyny. Hetyja ich imknieńni asabliwa ŭzmahlisia, kali ŭ Niamieččynie zapanawaŭ Hitler. Dajšło da taho, što litoŭskija niemcy kłajpedzkija stwaryli ŭ Kłajpedzie tajnuju hitleroŭskuju arhanizacyju, jakaja mieła na mecie zbrojnaj darohaj adarwać hety kraj ad Litwy i dałučyć da Niamieččyny.

Arhanizacyju hetu litoŭski ŭrad wykryŭ i winawatych addaŭ pad sud. Sudziŭ hitleroŭcaŭ sud wajenny. Sud adbywaŭsia publična. Abwinawačwalisia jany za zdradu Litwy i za zabojstwy. Na ławie abwinawačanych zasieła 126 hitleroŭcaŭ, litoŭskich hramadzian, na čale z Neumanam i Sasam. Sud trywaŭ try miesiacy i 12 dzion. Takoha wialikaha sudowaha pracesu Litwa jašče nia mieła. Zacikaŭleńnie było ahramadnaje nia tolki ŭ krai, ale i zahranicaj. U źwiazku z wajennymi apošnim časam pryhatawańniami Hitlera, sprawaj kłajpedzkaj zacikawilisia: Francyja, Italija, dziaržawy Małoj Antanty, a tak-ža Anhlija i Sawiety. Dyk niadziwa, što na sudzie byli prysutnyja nia tolki pradstaŭniki roznych zahraničnych hazet, ale tak-ža nawat i niekatoryja zahraničnyja dyplomaty.

Urešcie ŭ kancy minułaha miesiaca sud skončyŭsia. Wyniki jaho hetkija: 4 niemcy, jakim dakazany zabojstwy, prysudžany na karu śmierci, inšyja— ad dwuch hadoŭ wastrohu da wastrohu na ŭsio žyćcio, a 35 apraŭdany. Prysudžanyja padali kasacyju, heta znača prośbu, kab sprawa ich była razhledžana nanowa.

Paśla hetaha prysudu ŭ Niamieččynie padniaŭsia wialiki hwałt, kab Litwa pierapałochałasia i złahodziła swoj prysud nad hitleroŭcami. Litwa adnak na heta ŭsio hladzić spakojna, bo zrabiła toje, što zrabić musiła, zrabiła sprawiadliwa, a da taho za Litwoj staić Francyja, Sawiety i častkowa Anhlija. Zahraničnyja hazety, aprača niamieckich, prysud litoŭskaha sudu aceńwajuć dawoli spakojna i dla Litwy (prychilna.

Słowam, narod, jaki maje choć i niewialikuju swaju dziaržawu, moža siabie často abaranić i ad takoha słania, jak Niamieččyna. *P. Łuhanowič.*

Narady Francyi, Italii i Anhlii.

Paśla dyplomatyčnaj padarožy anhielskich ministraŭ u Niamieččynu, Sawiety, Polšč i ŭ Čechasławaččynu, 15 h. m. majuć adbycca ŭ m. Stresie na astraŭku Boromeo, pałožanaha na wodach Italii, palityčnyja narady — Francyi, Anhlii i Italii.

Hetyja wialikija dziaržawy buduć naradžacca ab sposabach zabiaśpiečańnia miru na dalej, biaručy pad razwahu ciapierašniaje napružanaje palityčnaje pałažeńnie ŭ Eŭropie. — Dasiulešnija prajekty zabiaśpiečańnia miru byli hetkija: — naddunajski dahawor na zachadzie i ŭschodni na ŭschodzie. Dziela taho, što Niamieččyna i Polšč nie zhadžajucca da ich prystupić, ab čym wyrazna dawiedalisia anhielskija dyplomaty padčas niadaŭnaj padarožy, treba spadziawacca inšaha sposabu wyrašeńnia sprawy.

Wajenny sajuz šašci dziaržaŭ.

Palityčnyja narady ŭ Štresie (horad u Italii) cikawiać uwieś palityčny świet. Wyniki hetych naradaŭ mohuć być hetkija: abo znajduć sposab, što zhodziacca na dahawor, asabliwa na ŭschodzie, Niamieččyna i Polšč, abo paŭstanie wialiki wajenny sajuz—Francyi, Sawietaŭ, Čechasławaččyny, Litwy, Rymynii i Tureččyny, jaki stanie ŭ supiareč imknieńniam Niamieččyny z sajuźnikami.

Sprawa heta ciapier źjaŭlajecca centralnaj ŭ mižnarodnaj palitycy i maje być wyrašanaj ŭ hetym miesiacy.

Zdajecca, što wynikam naradaŭ budzie ŭtwareńnie wialikaha wajennaha sajuzu. U Anhlii rastuć prociŭniamieckija nastroi, a ŭrad anhielski aktyŭna nie biare ŭčaścia ŭ twareńni h. zw. ŭschodniaha paktu.

Słowam, u Eŭropie tworycca silny prociŭniamiecki front.

Wybary ŭ Gdansku.

U min. niadzielu 7.IV u Gdansku adbylisia wybary ŭ miajscowy Senat. Z wynikaŭ hałasawańnia widać, što tam palakoŭ wielmi mała — na 236,733 hałasujučych palakoŭ tolki 8.300 asob. Bolšaść tam—heta niemcy. U wybarach pieramahli hitleroŭcy; za hitleroŭcaŭ hałasawała 139.043 asoby. Rešta hałasawała na inšyja niamieckija śpiski i 7990 za kamunistaŭ.

U nowym Gdanskim Senacie: narodnych socyjalistaŭ — 43, socyjalistaŭ 12, kamunistaŭ — 2, centr — 10, niamieckija narodniki — 3, palaki — 2.

Hitleroŭcy wyjhraŭšy ŭdačna plebiscyt u Saary, źwiarnuli swaje imknieńni ŭ napramku Gdansku i Kłajpedy. Biezsumniŭna, što samaj bajawoj zadačaj niamieckaha nacyjanalizmu, miž inšymi sprawami, jošć sprawa zaŭładańnia Gdanskam i Kłajpedaj.

Roznyja wiestki.

Z HAZET.

— Wiedamy balšawicki trubadur Radek u „Izwiestijach" piša, što hitleryzm maje prahramu stwaryć u Eŭropie nowuju niamieckuju imperyju, jakaja abymała-b eŭrapejski ŭschodni poŭdzień i značnuju častku eŭrapejskaha ŭschodu, ukľučajučy ŭ sferu swaich upływaŭ Polšč. Nawat Ukraina i Kaŭkaz mohuć być ekanamična źwiazany z Niamieččynaj. Rasiejskaja emihracyja pieradrukoŭwajučy heta zaklikaje i balšawikoŭ być rasiejskimi patryjotami—baranić „niedzielimost" Rasiei. Słowam, maskali bajacca razwału Sawietaŭ.

— „Kur. Wilenski" padaje: z bahasłaŭleńnia prawasłaŭnaha mitrapalita Dzianisa prybyŭ u Wilniu duchoŭnik *Prawasłaŭnaha Polskaha Narodnaha Kaścioła* daśledzić mahčymaści pašyreńnia ŭ nas nawuki i zakładzinaŭ hetaha kaścioła. Treba wiedać, što Mitrapolija Prawasłaŭnaj Carkwy ŭ Polščy zakľučyła uniju z „Polskim Narodowym Kościołem." Dyk heta nowaja unija — polskaje prawasłaŭje — pačynaje ŭžo dzieić i na wilenskim hruncie!...

Z POLŠČY.

Zakon ab adsročcy wajskowaj słužby. Zawiedzieny nowy zakon ab adsročkach wajskowaj słužby. Kaža jon ab adsročcy wajskowaj słužby adzinokim žywicielam siamji. Padani ŭ sprawie adsročki treba padawać ŭ pawietawaje starastwa.

U Berezie Kartuskaj — u izolacyjnym łahiery —palakoŭ užo niama. Jošć 60 ukraincaŭ; 16 kamunistaŭ.

Z ZAHRANICY.

Rasiejskija balšawiki pazyčajuć hrošy ŭ francuskich kapitalistaŭ. Kamunisty ŭžo zawiali družbu z kapitalistymi nie nažarty. Francuskija kapitalistyja pazyčajuć balšawikom paŭmiljarda złot. na paprawu rasiejskich čyhunak.

Zatopa. U Kitaju raka Žoŭtaja parwała zastawy i zaliła mnoha asieliščaŭ. Utapiłasia 20 tysiač ludziej i 100 tysiač narodu astałosia biez strachi nad haławoj.

Žydoŭskaja respublika. Sawieckija kamisary abwieścili nowuju žydoŭskuju respubliku ŭ Krymie. Tam užo daŭno pasialajucca Žydy; im zawodzić haspadarki pamahaje amerykanski „Abjednany Kamitet Razsialeńnia Žydoŭ."

Z WILNI.

Biezrabotnyja damahajucca pracy. Nadowiačy biezrabotnyja źjawilisia ŭ magistrat i damahalisia pracy. Magistrat nia maje hrošaj, dyk raboty dla biezrabotnych dać nia moža.

Пісьмы з вёскі.

DA NAŠYCH KARESPANDENTAŬ.

Hetym wietliwa prosim našych wiaskowych karespandentaŭ pisać karespandencyi ab žyćci biełaruskaj wioski mahčyma koratka, a tak-ža i wyrazna. Na wialikija karespandencyi nia majem miesca ŭ našaj hazecie — treba drukawać ab usim patrochu. Z hetaj pryčyny skaročwajem sami Wašyja karespandencyi.

Redakcyja „B. Krynicy."

— **Запольле**, Пачапаўскай вол., Навуградзкага пав. — Цяжка ў нас жывецца: гаспадаркі дробныя, усё сялянскае таннае— жыта 1 зл. 50 гр. за пуд, укормлены вяпрук —50 гр. за кілё, заработкаў ніякіх няма, падаткі вялікія. Безработных у вёсках многа — хіба няма такой вёскі, каб ня мела 100 асоб безработных. Запольскі.

— **Семяновічы**, Раготненскай вол., Слонімскага пав. — У нас, 22,III.1935 г. здарыўся жудасны факт. Браты Сідорчыкі пабіліся ў споры за мяжу. Адзін забіты на месцы, а двух адвезьлі ў шпіталь раненых.

Патрэбна зямельная рэформа, бо людзі ня маюць на чым жыць, а дзеля гэтага сваркі і бойкі.

Сямён.

— **Nowajelnia, Nawahradčyna.**— Letaś palicyja wyjawiła ŭ našaj wakolicy kamunistyčnuju jačejku. Pawadyrami hetaj jačejki byli maładyja žydki. Kamunistyčnaja jačejka nadta-ž ahitawała prociŭ biełaruskaj narodnaj sprawy. Słowam, kamunisty starajucca zahłušyć biełaruski narodny ruch. Biełarusy, nie paddawajmasia kamunistyčnaj ahitacyi, bo kamunisty chočać paniawolić biełaruskaje sialanstwa — chočać zahnać nas u kamunu, dzie buduć kamandawać maładyja žydki-kamisary. I. Špak.

— **Стоўпцы**, — Благі маюць некаторыя беларусы звычай, што чураюцца роднай мовы. Родная мова, свая песьня і свае народныя звычаі — гэта скарб народу. Дык шануйма гэта ўсё; усюды, дзе толькі трэба, гаварэм сваей беларускай мовай і хадзем на свае беларускія прадстаўленьні.

Т. В.

— **Ješkawičy**, Niaświskaha paw. Našaja wioska wialikaja i nacyjanalna świedamaja. Usie našyja sialanie wiedajuć, što jany biełarusy. Našaja wioska dawoli kulturnaja — starajecca dobra haspadaryć, racyjanalna haduje žywiołu i wiedaje canu kooperacyi. Adna biada — nadta-ž drobnyja haspadarački i ŭsio ziemlarobskaje tannaje. Padatki ciažkija. Nia ŭśpieje sielanin padhadawać žywiolinu, a sekwestratar jaje ŭžo apiša za padatki.

Pak—ny.

— **Міраўка**, каля Радашкавіч, Маладэчанскага пав. — Страшнае здарэньне было 24 лютага сёлета ў нашай ваколіцы. У Дэкшнянах было вясельле. Звычай у нас такі, што моладзь зыходзіцца на вясельле з ваколічных вёсак. Зышлася моладзь і ў Дэкшняны. Зышоўшыся пачала біцца пушчаючы ў ход: сьвінцоўкі, сякеры, нажы і другія прылады. У выніку — 2-х забітых і некалькі цяжка раненых.

Дарагая моладзя, прасьвячайся! — чытай газэты, кніжкі і займайся культурнымі справамі, бо інакш, дык зусім зьдзічэеш.

Міраўскі.

— **Klony**, Šarkaŭskaj wol., Dziśnienskaha paw. —Mołaďź našych wakolic cikawicca biełaruskimi hazetami i knižkami. Biada, što nadta-ž trudna atrymać hetyja druki pierasyłanyja poštaj — adrasy našyja takija błudnyja, što ani nam biełaruskich drukaŭ, ani hetym drukam nas nijak znajści nia možna. Mołaďź našaja lubić i biełaruskija pradstaŭleńni. Treba pjesaŭ z małym likam ihrajučych asob. Niezamožny.

— **Іванавічы**, Моўчадзкай вол., Баранавіцкага пав. — У нас людзей граматных ёсьць, але няма ініцыятывы. Быў у нас гурток ТБШ. і тады паставілі два беларускія прадстаўленьні. Гурток ТБШ. замёр разам з цэнтраляй гэтай арганізацыі. Нашыя людзі зьбіраліся адкрыць гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры, але дасюль не адкрылі.

Браты, атрасіцеся ад заспанасьці і залажыце гурток БІГіК!

Баранавіч.

— **Клочкава**, Беніцкай вол., Маладэчанскага пав. — 27.II. сёлета адбылося ў нас беларуска-польскае прадстаўленьне. Прадстаўленьне гэтае ладзіла арганізацыя „Стшэльцаў."

Юрачка.

— **Райца**, каля Наваградка. — Сяляне ўжо без беларускага календара не абходзяцца. Блізу ў кожнай хаце ёсьць свой беларускі календар. За сёлетні календар усе дзякуюць выдаўцом —надта добра выданы. Селянін.

— **Дуброва**, каля Наваградка. Да нас даходзіць „Бел. Крыніца" і ўсе ёй цікавяцца. Моладзь надта любіць чытаць беларускія кніжкі, але іх трудна даставаць. Трэба шырыць на вёску беларускую літаратуру. Цьв. Рук.

— **Грыцэвічы**, Нясьвіскага пав. —Нашая новая валасная Рада складаецца з 20 асоб. Палавіна радных — беларусы. З пастаноў гэтай рады можна адцеміць— утрыманьне валасной акушэркі, вэтэрынара і арганізацыя валаснога хлебнага магазыну. З шараваркам у нас сапраўдная бяда. Кажуць, што шараваркамі будзе заведываць ад 1936 году „Ужонд Дрсговы."

К. Хлебароб.

— **Баяры**, Мядзельскай вол., Пастаўскага пав. — 17 лютага сёлета было ў нас беларускае прадстаўленьне. Ігралі „Паўлінку." Народу было многа. Людзі беларускімі прадстаўленьнямі цікавяцца. Моладзь ахвотна бярэцца за гэтае дзела. Трэба толькі прыхільнасьці з боку цяпер сільных да культурнай працы. За пару гадоў вёска культурна шмат падрасла-б.

Сусед.

— **Arlaniaty**, Ašmianski paw. — Ciažka žywiecca kala nas sialanam— taksama, jak i ŭ druhich biełaruskich wakolicach. U našaj wioscy jość hurtok Bieł. Ist. Haspad. i Kultury, jaki ŭ 1932 h. źladziŭ biełaruskaje pradstaŭleńnie i z taho času „adpačywaje." Dla našaj wioski — Arlaniat — stydnawata, što hetak zaniadbana kulturna-praświetnaja praca. Ja spadziajusia, što sioleta ŭ nas praca zrušycca z miesca. Treba ŭziacca za pracu ŭ hurtku, — treba pradusim uparadkawać bibliateku.

Wiaskowy.

— **Šalciny**, Brasłaŭskaha paw. Biełaruskaja świedamaść u našaj wakolicy, nia hledziačy na ciažkija abstawiny biełaruskaj pracy, pašyrajecca i raście. Wolnaja dumka nia wiedaje pieraškod, bo nichto jašče na jaje putaŭ nia prydumaŭ.

U mieru rostu biełaruskaje świedamaści, starajucca apošnim časam pahuścić sietku polskich „kułak" i ŭ našaj hminie.

Nazwanyja „koły" hurtujuć (na papiery) pierawažna „wialikich dziaciej" z niekulki wiosak, dziaciej, kali nie hadami, dyk paniaćciami. I tak prykładam „Koło Młodzieży W." u Rybačkach paŭstała dziakujučy snom ab patefonie; znoŭ-ža hetkaje koła u w. Nawičkach sarhanizawałasia niadaŭna dziakujučy abiacankam arhanizataraŭ, što paśla siabroŭ koła pawiazuć darma „Polšč ahladać."

Biełaruskaja Mołaďź! Preč z dziacinnymi snami i dziacinnym strachami! Hurtujsia ŭ swaich biełaruskich arhanizacyjach!

Naddźwiniec.

— Budsłaŭski hurtok Bieł. Instytutu Haspadarki i Kultury hetym wyražaje padziaku swajmu siabru Br. Chadalonku za pomač dla hurtka ŭ sumie 10 łataŭ, jakija hurtok atrymaŭ.

Urad hurtka.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič